РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

25 сьнежня 2018 г.

# ПРЭС-РЭЛІЗ

## Узнагароджаньне Мэдалём да стагодзьдзя БНР

Рада Беларускае Народнае Рэспублікі абвяшчае пра ўзнагароджаньне Мэдалём да стагодзьдзя Беларускае Народнае Рэспублікі. Адпаведны дэкрэт падпісаны Старшынёю Рады БНР.

Згодна са сваім статутам, Мэдаль уручаецца за пажыцьцёвыя заслугі ў працы дзеля зьдзяйсьненьня ідэалаў 25 сакавіка, у тым ліку за дасьледваньні і папулярызацыю беларушчыны, здабыцьцё і ўмацаваньне дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі, барацьбу за свабоду і дэмакратыю ў Беларусі.

Мэдаль уручаецца:

- Асобам, якія адзначыліся на ніве змаганьня за волю і незалежнасьць Беларусі,

- Выбітным грамадзкім і культурніцкім дзеячам у Беларусі і сярод беларускага замежжа,

- Замежнікам, якія спрычыніліся да дасьледваньняў і папулярызацыі Беларусі ў сьвеце, а таксама іншым чынам спрыялі нацыянальным інтарэсам Беларусі.

Сярод узнагароджаных – першы амбасадар ЗША ў Беларусі Дэвід Сўорц і амбасадар Швэцыі ў Беларусі Стэфан Эрыксан; палітыкі і грамадзкія дзеячы; вэтэраны беларускага незалежніцкага руху і палітычныя вязьні; дасьледчыкі Джым Дынглі, Арнольд Макмілін, Адам Мальдзіс; акадэмік Радзім Гарэцкі; пісьменьнік Уладзімер Арлоў; стваральнікі эталёну дзяржаўнага гербу “Пагоня” Аляксей Марачкін і Леў Талбузін; і многія іншыя.

Агулам узнагароджаныя больш за 130 асобаў зь Беларусі і замежжа.

Уручэньне ўзнагародаў адбудзецца на працягу 2019 года.

---

**Кантакт:**

pressgroup@radabnr.org
www.radabnr.org
www.facebook.com/radabnr
www.twitter.com/radabnr